**Валянціна ВАХІТАВА**

## Дарога палявая

*Мая дарога палявая,*
*Куды вядзеш, бяжыш куды?*
*Адна ў свеце ты такая,*
*Бо беражэш мае сляды.*
*Дзе б ні была, дзе б ні жыла я,*
*І па якіх шляхах не ішла,*
*А ты, дарога палявая,*
*Праз маё сэрца пралягла.*
*І не дае памяць пакою,*
*Цябе я бачу ў сваіх снах.*
*І горач пылу адчуваю,*
*І смак ягоны на губах.*
*Шумяць жытнёвыя палеткі,*
*Уздоўж дарогі васількі,*
*Далёкага дзяцінства сведкі,*
*Я з іх калісь пляла вянкі.*
*Бяжыць дарога палявая,*
*Стаіць жытнёвая сцяна.*
*Да болю родная такая,*
*Такіх у свеце больш няма.*